This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2025.pp.133-180

Przegląd Środkowo-Wschodni, 10, 2025
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20251006

Data przesłania: 26.01.2025
Data akceptacji: 05.03.2025

**Яўген Малікаў**
незалежны даследчык
кандыдат мастацтвазнаўства
(PhD in art history)
malikau2017@gmail.com
ORCID: 0009-0009-1177-0899

# Асаблівасці традыцыі разьбянога архітэктурнага дэкору драўляных будынкаў г. Магілёва канца XIX – сярэдзіны XX ст.[1]

**Specyfika tradycji snycerskiej dekoracji architektonicznej budynków drewnianych Mohylewa w końcu XIX – połowie XX w.**

W artykule została przedstawiona tradycja snycerskiego zdobnictwa architektury drewnianej w Mohylewie od końca XIX do połowy XX w. Na podstawie analizy dużej liczby zebranych materiałów fotograficznych Autor dokonał klasyfikacji zdobnictwa architektonicznego, zidentyfikował i opisał cechy charakterystyczne dekoracji architektury drewnianej tego miasta.

Słowa kluczowe: snycerski wystrój architektoniczny, dekoracyjna rama okienna, fronton, obraz artystyczno-dekoracyjny, drewniany budynek

[1] Гэтая публікацыя з’яўляецца часткай праекту “Традыцыі разьбянога дэкора драўлянай архітэктуры Магілёўскай вобласці Беларусі” (“Traditions of carved decoration of wooden architecture of the Mahilew region of Belarus”), прафінансаванага ў межах стыпендыяльнай праграмы «Support for Advanced Learning and Training – EU4Belarus-SALT» Стыпендыі беларускім выкладчыкам, навукоўцам і аспірантам вышэйшых навучальных і даследчых устаноў ЕС», якая праводзіцца ў рамках знешняй дзейнасці Еўрапейскага саюза (лістапад 2023 – красавік 2024 г.).

## Уводзіны

Усход Беларусі, асабліва паўднёвы ўсход, здаўна вядомы даследчыкам як тэрыторыя бытавання найбольш яркага разьбянога дэкору ў народным драўляным дойлідстве Беларусі[2]. Аднак традыцыі архітэктурнага дэкору самай усходняй яе часткі – сучаснай Магілёўскай вобласці, ніколі не з'яўляліся аб'ектам навуковага даследвання і збольшага невядомы ў тэматычнай літаратуры. Старажытным культурным цэнтрам гэтага рэгіёну, які ахоплівае значную частку Верхняга Падняпроўя, з'яўляецца горад Магілёў.

У 2019 г. аўтар дадзенага артыкула правёў 10 экспедыцыйных выездаў у г. Магілёў з мэтай збору фотаматэрыялу па драўлянай архітэктуры і яе архітэктурнаму дэкору. Сабраная аўтарам фотабаза ўключае фотаздымкі з выявамі 464 будынкаў г. Магілёва (4062 лічбавыя фотаздымкі), з якіх 366 драўляных будынкаў аздоблены архітэктурным дэкорам. Агулам па Магілёўскай вобласці за перыяд 2007–2020 гг. аўтарам была сабрана 11265 фотаздымкаў з выявамі 1808 будынкаў з Магілёва, Бабруйска і яшчэ 11 гарадоў (на паўночны ўсход, усход і поўдзень ад абласнога цэнтра), што дало магчымасць параўноўваць аналізуемы матэрыял па традыцыям разьбянога дэкору драўлянай архітэктуры на дастаткова вялікай тэрыторыі. У выніку склалася разуменне, што горад Магілёў з'яўляецца адным з адавочных выразных цэнтраў развіцця драўлянага архітэктурнага дэкору на тэрыторыі даследванай часткі Магілёўскай вобласці.

Магілёў – горад на ўсходзе Беларусі, на сёння налічвае каля 350 000 жыхароў. Сталае паселішча людзей на месцы Магілёва існуе з XII ст., упершыню на старонкі гістарычных крыніц горад трапіў у XIV ст. Асасбівы росквіт горада пачаўся ў першай палове XVI ст., калі ў выніку няўдалых для Вялікага княства Літоўскага войн у 1514 г. маскоўскімі войскамі быў захоплены Смаленск, і менавіта Магілёў стаў галоўным цэнтрам гандлю на ўсходзе Вялікага

[2] А.І. Лакотка, *Пад стрэхамі прашчураў,* Мінск 1995, с. 276.

княства Літоўскага. У 1561 г. горад атрымаў магдэбурскае права. Усё гэта разам садзейнічала росквіту не толькі эканомікі, але і мастацкай культуры гэтага горада. У XVII–XVIII ст. горад стал галоўным мастацкім і культурным цэнтрам на ўсходзе Беларусі, тут склалася своеасаблівая школа каменнага дойлідства, кнігадрукавання і інш.

Аналіз сабраных фотаматэрыялаў па драўлянай архітэктуры горада і рэгіёна паказаў, што ў канцы XIX – сярэдзіне XX ст. у Магілёве існавала свая выразная традыцыя разьбянога дэкору ў драўлянай архітэктуры. Дадзены артыкул з'яўляецца першай спробай навуковага апісання гэтай своеасаблівай з'явы.

Акрамя натурных фотаздымкаў драўлянай забудовы горада па стане на 2019 г. важнай крыніцай інфармацыі па гэтай тэме сталі фотаздымкі з відамі горада, зробленымі ў канцы XIX – пачатку XX ст., 1941–1944 гг. і другой паловы XX ст., на якіх зафіксаваны ўжо неіснуючыя драўляныя будынкі горада. Сканы такіх фотаздымкаў былі атрыманы ў першую чаргу ад калекцыянераў (Алег-Давід Лісоўскі з Аўгсбурга, Аляксей Балакіс з Магілёва і інш.).

Інфармацыя аб датах ўзвядзення зафіксаваных у 2019 г. будынкаў была атрымана з матэрыялаў архіву РУП “Магілёўскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельнаму кадастру”. Нажаль, афіцыйныя дадзеныя не ўтрымлівалі дакладную інфармацыю аб датах пабудовы на ўсе зафіксаваныя будынкі, рэдкія з дат былі ранейшымі за пачатак XX ст., але не гледзячы на гэта атрыманыя даты дазволілі ў агульных рысах прасачыць па часе тэндэнцыі развіцця драўлянага архітэктурнага дэкору ў Магілёве ў канцы XIX – сярэдзіне XX ст.

Асноўным метадам даследвання быў параўнальна-гістарычны аналіз зафіксаваных на фотаздымках драўляных будынкаў і элементаў іх архітэктурнага аздаблення, сістэматызацыя і апісанне атрыманых вынікаў. Таксама выкарыстоўваліся і іншыя агульнанавуковыя метады.

Для аналізу сабранага матэрыялу структура драўляных будынкаў і іх разьбяное аздабленне былі падзелены на тры візуальныя ўзроўні ў адпаведнасці з канструкцыяй самога будынка:

– верхняя частка будынка – узровень даху, у дэкор якога ўваходзіць сістэма аздабленняў франтона-шчыта (уключна з малюнкам зашыўкі франтона, накладнымі элементамі, формай шчытавых вокнаў і іх аконнымі пераплётамі і інш.), разьбяныя закрыліны і падзоры па лініях краю страхі, вільчыкі, аб'ёмныя канструкцыі з пераплеценых рэяк ў полі франтона, скульптурна апрацаваныя канструкцыйныя элементы (ніжнія канцы кроквaў);

– сярэдняя частка будынка – узровень сцен, аздабленне якога складаюць абшыўка сцен шалёўкай (ці яе адсутнасць), карнізы, аконныя ліштвы, вуглы, дзверы і ганкі;

– ніжняя частка – узровень падмурка, аздабленні якога не былі зафіксаваны.

Агульнараспаўсюджаны ў Магілёве і ўцэлым па рэгіёне тып традыцыйнага дома ўяўляе сабой аднапавярховы драўляны зруб чатырох-пяцісцен пад двухсхільным дахам, пастаўлены тарцом на два акны да вуліцы. У гарадах і мястэчках, дзе заможнасць насельніцтва дазваляла ўзводзіць большыя па памерах будынкі, шырокае распаўсюджанне набылі будынкі ў два паверхі альбо з ніжнім цагляным цокальным паверхам, а таксама і іншыя варыянты. У гарадскім драўляным дойлідстве таксама шырокае распаўсюджанне атрымала ўжыванне чатырохсхільных дахаў, але відавочна, што двухсхільныя дахі дамініравалі. Сістэма дэкаратыўных аздабленняў, выпрацаваная ў майстроў драўлянай архітэктуры Магілёва, аднольнавая для ўсіх варыянтаў ужываных будынкаў. Важнай асаблівасцю таксама з'яўляецца прыхільнасць драўлянай архітэктуры Магілёва да відавочна шырокіх тарцавых фасадаў, часам нават на 4–5 вокнаў, пад высокім двухсхільным дахам (мал. 1).

## Дэкор даху

Прыхільнасць жыхароў Магілёва да вывядзення шырокага тарцавога фасаду драўляных будынкаў на вуліцу, патрабавала, адпаведна, выконваць таксама шырокі і высокі франтон (шчыт) будынка,

што рабіла яго заўважным элементам ў стварэнні прывабнага вобраза ўсяго будынка і патрабавала дадатковага дэкаравання. Часам вышыня франтона была блізкай да вышыні сцен будынка і ўкампазіцыі фасада такі франтон уяўляў сабой фактычна асобны паверх.

Улічваючы велізарныя памеры, характэрныя для франтонаў Магілёва, відавочная манатоннасць абшыўкі дошкамі такога шчыта (тымпана) патрабавала дадатковых дэкаратыўных элементаў. Сістэму аздаблення шчыта складаюць наступныя элементы, якія ўжываліся ў розных узаемаспалучэннях паміж сабой: малюнак абшыўкі шчыта дошкамі, акно на ім, разьбяныя паяскі і акантоўкі, накладзеныя непасрэдна на шчыт.

## Малюнак абшыўкі шчыта

Канструкцыйна першасным элементам аздаблення шчыта драўлянага будынка з’яўляецца малюнак утвораны рытмічным размяшчэннем дошак яго абшыўкі.

Найбольш старым і пашыраным варыянтам з’яўляецца простая вертыкальная абшыўка, якая бязспрэчна дамініравала ў будынках збудаваных да 1917 г., асабліва на франтонах невялікіх памераў.



Мал. 1. Магілеў. вул. Яцыны 13. 1922 г.



Мал. 2. Магілеў, вул. Вялікая Чавуская 46. 1947 г.

Другім па колькасці сярод зафіксаваных з’яўляецца варыянт двухраднай абшыўкі, пры якой ніжні рад вертыкальны, а верхні з перпендыкулярна ўкладзеных адносна схілаў даху дошак. Больш за палову з зафіксаваных прыкладаў такой укладкі змешчаны на будынках узведзеных у перыяд 1945–1960-х гг., хаця такі варыянт абшыўкі часам сустракаецца і на матэрыялах да 1917 г. (мал. 2)

Усе астанія зафіксаваныя варыянты абшыўкі шчыта значна адстаюць па колькасці ад вышэйназваных – двухрадная вертыкальная абшыўка франтона, гарызантальная абшыўка, двухрадная абшыўка з вертыкальным ніжнім ярусам і гарызантальным верхнім і інш.

Агульная дынаміка распаўсюджання найбольш пашыраных варыянтаў дэманструе тэндэнцыю да ўскладнення малюнка абшыўкі шчыта, але адзінкавыя зафіксаваныя варыянты паказваюць ўжыванне досыць складаных кампазіцый на вялікіх франтонах ужо ранніх будынкаў, узведзеных да 1917 г.

Трэба адзначыць, што ўжыванне на шчытах будынкаў асобных накладных геаметрычных фігур у выглядзе ромбаў, квадратаў і іншых не сустракаецца на будынках Магілёва узведзеных да 1941 г. Аднак накладныя ромбы, квадраты, салярныя разеткі і крыжы на шчытах будынка шырока распаўсюджваюцца ў будаўніцтве пасля 1945 г., што, верагодна, звязана з міграцыяй насельніцтва. **(**мал. 2)

## Шчытавыя вокны

Важнейшым, а ў некаторых выпадках часам нават галоўным і адзіным, элементам аздаблення франтона (шчыта) дому ў Магілёве з’яўляецца шчытавое акно. У Магілёве такія вокны адрозніваюцца сваімі формамі, памерамі, наяўнасцю і ўзроўнем разьбянога аздаблення ліштвы вакол аконнага праёма..

Усе распаўсюджаныя ў Магілёве шчытавыя вокны можна падзяліць на чатыры асноўныя тыпы. Іх супастаўленне паміж сабой паказвае тэндэнцыю ўскладнення ад найбольш простых (і відавочна архаічных) варыянтаў I і II тыпаў, да складаных варыянтаў III і IV

тыпаў, ад простых плоскіх накладак да выразна аб'ёмных і шматпланавых кампазіцый. Відавочна, што гэтая тэндэнця не выпадковая.

Найбольш пашыранай ў Магілёве з'яўляецца прамавугольная форма праёма шчытавых вокнаў, традыцыйная для народнага дойлідства па ўсім даследваным рэгіёне. Аднак выразнай асаблівасцю Магілёва з'яўляецца прыблізна такое ж колькаснае распаўсюджанне пяцівугольнай формы праёмаў шчытавых вокнаў ("трохвугольнік на квадратам"). Улічваючы, што ў горадзе таксама часам сустракаецца форма шчытавога акна з акруглым верхнім абрысам, дык можна дапусціць што абедзьве гэтыя формы карэлірующца паміж сабою, з'яўляюцца адлюстраваннем нейкай агульнай для іх ідэі, прататыпа ці заканамернасці.

І тып (мал. 3). Да яго адносяцца найбольш простыя і, верагодна, самыя архаічныя варыянты шчытавога акна у выглядзе невялікіх адтулін розных форм (пяцівугольнік, прамавугольнік, паўкруг і інш.), якія па сваіх памерах прыблізна супадалі з шырынёй дошкі абшыўкі шчыта.

ІІ тып (мал. 4). Такія шчытавыя вокны з'явіліся ў выніку ўскладнення вокнаў І тыпа праз значнае павелічэнне памераў і ўжыванне ліштваў у выглядзе раўнамернай абламоўкі праёма плоскай ці слабапрафіляванай дошкай.



Мал. 3. Магілёў, Першамайскі зав. 26. Да 1917 г.



Мал. 4. Магілёў, вул. 2-я Чыгуначная 38. 1924 г.

III тып (мал. 5–6). Гэты тып шчытавых вокнаў з'явіўся ў выніку ўскладнення ліштваў-рамак вокнаў III тыпу за кошт выкарыстання замест плоскіх ці прафіляваных дошак, больш дэкаратыўных варыянтаў апрацаваных разьбой – краявой, прапільной, варатковай ці глухой. Ужо на будынках 1900–1910-х гг. шырока фіксуюцца найбольш распрацаваныя і ўскладнёныя варыянты вокнаў гэтага тыпу, якія, разам з адпаведным аздабленнем усёй кампазіцыі франтона, бязспрэчна з'яўляюцца адной з вяршынь дасягненняў магілёўскіх майстроў разьбянога архітэктурнага дэкору.



Мал. 5. Магілёў, вул. Чэхава 30. Да 1917 г.



Мал. 6. Магілёў, вул. Мендзялеева 5. 1920–1930-х гг.



Мал. 7. Магілёў, вул. Вароўскага 27. Да 1917 г.



Мал. 8. Магілёў, вул. Карпінскага 14. Канец XIX – пачатак XX ст.

IV тып (мал. 7–8). Шчытавыя вокны гэтага тыпу дастаткова рэдкія і разнастайныя па сваім выкананні і, у адрозненне ад папярэдніх тыпаў, не маюць стандартнага набора канструкцыйных элементаў, але маюць стандартны кампазіцыйны набор – асіметрычнае выдзяленне верхняй (часам і ніжняй) часткі, сіметрыя кампазіцыі адносна вертыкальнай восі, а не ўяўнага цэнтра аконнага праёма.

## Пераплёты шчытавых вокнаў

Асобнымі элементамі аздаблення франтонаў будынкаў Магілёва з'яўляюцца пераплёты шчытавых вокнаў. Розныя варыянты геаметрычных і рытмічных фігур, утвораныя драўлянымі элементамі пераплёту акна, асабліва пры афарбоўцы ў белы колер, ярка і кантрасна вылучаюцца на цёмнам фоне аконнага праёма ці аздобленай разьбой ліштвы і дадаткова акцэнтавалі ўвагу гледача на цэнтры кампазіцыі ўсяго франтона.

Невялікія па памерах шчытавыя вокны, за рэдкім выключэннем, не маюць аконнага пераплёта (гл. мал. 3), і наадварот – вялікія аконныя праёмы заўжды патрабавалі вялікіх аконных пераплётаў. Найбольш простыя з іх уяўляюць сабой Т-падобную альбо крыжападобную вертыкальную рэечную аснову, якая па перыметры заключана ў раму, а ва ўтвораныя ячэйкі ўстаўляліся шыбкі (мал. 4). Больш распрацаваныя варыянты ўяўляюць сабой складаныя геаметрычныя кампазіцыі розных малюнкаў (мал. 5, 6).

## Апрацаваныя разьбой ніжнія канцы вертыкальных дошак абшыўкі шчыта

Адной з важных і выразных асаблівасцяў драўлянай архітэктуры Магілёва з'яўляецца апрацоўка разьбой (краявой, скразяной) ніжніх канцоў вертыкальных дошак абшыўкі шчыта, якія разам утвараюць выразную гарызантальную зубчатую паласу, накшталт наборнага разьбянога пояса. У дасканалым варыянце выканання

такі разьбяны пояс гарызантальнай лініяй свабодна звісае са шчыта (мал. 9, 10). Такое афармленне можа быць выкарыстана на вертыкальных дошках як пры суцэльнай зашыўцы франтона, так і пры двух-трохраднай, у якой ніжні рад абавязкова вертыкальны. Неабходнасць апрацоўваць ніжнія канцы дошак абшыўкі шчыта вялікімі выразнымі контурнымі ці скразянымі фігурамі прывяла да таго, што ў драўлянай архітэктуры Магілёва вертыкальны рытм абшыўкі шчыта вельмі часта ўтвараецца менавіта шырокімі дошкамі, а не вузкімі нашчыльнікамі.



Мал. 9. Магілёў, Белякова зав. 5. 1924 г.



Мал. 10. Магілёў, Аршанскі зав. 3. 1929 г.

Аналіз сабраных матэрыялаў паказаў, што найбольш раннія (канца XIX ст.) зафіксаваныя варыянты такога аздаблення першапачаткова знаходзіліся ў полі франтона (у тымпане), былі апрацаваны ў выглядзе трохвугольнікаў ці кругоў і часта дадаткова накладзены на фон з гарызантальнай дошкі падшыўкі знізу шчыта. Але ўжо на дамах узведзеных да 1917 г. актыўна ўжываюцца ўскладнёныя варыянты такога аздаблення, як у выглядзе розных варыянтаў геаметрызаваных фігур, так і ў выглядзе вельмі распрацаваных карункавых варыянтаў афармлення ніжніх канцоў вертыкальных дошак абшыўкі шчыта, якія звісаюць з нізу поля франтона, альбо накладзены на дошкі падшыўкі карніза (фрыза) уверсе сцяны. Та-

кім чынам, такое аздабленне магло свабодна звісаць з поля франтона, альбо быць накладзеным на абшыўку франтона ці дошкі карніза (фрыза) уверсе сцяны будынка, але пры гэтым яно захоўвала сваю галоўную ідэю – стварэнне на мяжы нізу франтона выразнай гарызантальнай арнаментальнай паласы, апрацаванай рознай складанасці разьбой, якая ўцэлым утварала зігзагавую лінію.

Гэтае аздабленне нізу франтона часта не толькі візуальна павязана з прасторай карніза (фрыза) будынка, але і фізічна – у шматлікіх зафіксаваных выпадках утвораная паласа зігзагавага арнаменту з аздобленых ніжніх канцоў вертыкальнай абшыўкі шчыта на тарцавым фасадзе будынка пераходзіць і на карнізы (фрызы) бакавых сцен. У выніку ўтвараецца агульная суцэльная арнаментальная паласа па ўсяму перыметру верха сцен будынка, у якой часам нават у мэтах навуковай класіфікацыі цяжка аддзяліць аздабленне ніза франтона будынка ад аздабленняў верха сцен будынка.

## Разьбяныя накладныя паяскі і акантоўкі

Асобным відам аздаблення шчыта з'яўляюцца разьбяныя накладныя паяскі і акантоўкі (мал. 11, 12). Яны размяшчаюцца непасрэдна на шчыце, дыяганальна па лініях схілаў даху (у вуглу ўтвораным шчытом і навіссю даха), гарызантальна пасярод шчыта (калі яго кампазіцыя складаецца з двух-трох ярусаў) альбо ў выглядзе разьбянога пояса знізу шчыта, (часта ўжо фактычна наверсе сцен будынка).

Найбольш простыя варыянты такіх накладных паяскоў і акантовак уяўляюць сабой простыя прафіляваныя рэйкі, накшталт плінтуса. Большасць зафіксаваных варыянтаў ўяўляюць сабой плоскую дошку, апрацаваную вараткoвай альбо краявой разьбой рознага абрысу. Часта сустракаюцца такія паяскі, выкананыя з двух накладзеных адна на адну дошак, кожная з якіх апрацавана краявой разьбой рознага малюнка.

Гэтыя ж накладныя паяскі, выкананыя ў той жа тэхніцы і па тым жа лекалам, часта змяшчаліся вакол шчытавых вокнаў, утвараючы

разьбяную ліштву. Таксама яны часта ідэнтычны ўжываным пры стварэнні разьбяных закрылін і карнізаў на дамах Магілёва.



Мал. 11. Магілёў, вул. Вароускага 27. Да 1917 г.



Мал. 12. Магілёў, вул. Мянжынскага 34. 1926 г.

## Падзоры і закрыліны

Важнай часткай аздаблення верхняй часткі будынкаў у драўлянай архітэктуры даследваемага перыяду і рэгіёну, асабліва ў вялікіх гарадах, да якіх, відавочна адносіўся і Магілёў, з'яўляліся разьбяныя падзоры і закрыліны, якія змяшчаліся па знешніх лініях даху – на дыяганалях ветраніц на тарцах франтона і па краі надвісаючай над сцяной часткі даху. Такія разьбяныя падзоры і закрыліны ўжываліся двух тыпаў – зробленыя з адной доўгай цэльнай гарызантальнай дошкі, апрацаванай рознымі варыянтамі краявой разьбы ("цэльнадошкавыя падзоры", мал. 13, 14) ці састаўленыя з шэрага кароткіх вертыкальных дошак апрацаваных па адным лекале, якія ўтвараюць наборны шэраг ("састаўныя падзоры", мал. 15, 16)[3].

Аднак, не гледзячы на тое, што драўляная архітэктура Магілёва мела відавочна схільнасць да завышанай дэкарыцыі верхняй часткі

[3] Я.Р. Малікаў, *Традыцыі разьбянога дэкору ў народнай архітэктуры паўднёва-ўсходняй Беларусі: канец XIX – першая палова XX ст.*, Мінск 2016, с. 100–104, 212–213.

будынка, а менавіта яго франтона, разьбяныя падзоры і закрыліны (якія па сваім размяшчэнні павінны былі б значна аздобіць верхнюю частку любога будынка) не набылі ў Магілёве шырокага распаўсюджання, яркіх форм і вялікай разнастайнасці. Будынкаў горада Магілёва з такімі варыянтамі аздаблення даху ў час натурных збораў 2019 г. зафіксавана каля 30 штук на ўвесь перыяд 1900–1960-х гг., што складае каля 8% ад агульнай зафіксаванай колькасці будынкаў з драўляным разьбяным дэкорам, не кажучы ўжо пра агульную колькасць будынкаў горада ўвогуле.

Канешне, разьбяныя аздабленні ліній падзораў і закрылін сустракаюцца ўжо на ранніх зафіксаваных будынках Магілёва пачатку XX ст. Сярод іх выяўлены дастаткова архаічныя варыянты, выкананыя ў тэхніцы глухой (рэльефна-геаметрычнай) разьбы. Блізкімі да іх з’яўляюцца таксама варыянты выкананыя ў тэхніцы краявой і вараткoвай разьбы. З іншага боку, колькасць зафіксаваных прыкладаў разьбяных падзораў і закрылін мінімальная, пераважная большасць зафіксаваных будынкаў іх увогуле не мае. Гэта, відавочна, не выпадковасць, а адлюстраванне нейкіх глыбінных мастацкіх прыярытэтаў магілёўскіх дойлідаў і заказчыкаў драўлянай архітэктуры.



Мал. 13. 1900. Магілёў, вул. Герцана 24. 1895 г.



Мал. 14. Магілёў. Герцана 26. 1890 г.

Важна адзначыць, што найбольш складаныя і яркія з мастацка-дэкаратыўнага пункту гледжання варыянты такіх аздабленняў – састаўныя разьбяныя падзоры і закрыліны, якія ў вялікай колькасці прадстаўленыя, напрыклад у суседняй ніжнепасожскай традыцыі, у Магілёве зафіксаваны адзінкавымі экзэмплярамі на жылых будынках пачатку XX ст. Тры розныя варыянты выяўлены ў час натурных збораў 2019 г. на двух існуючых дамах, іх разьбяныя выявы адлюстроўваюць варыянты звісаючых зверху раслінных матываў (мал. 15, 16). Яшчэ чатыры кепскачытаемыя прыклады адзначаны на ўжо неіснуючых будынках, зафіксаваных на старых фотаздымках.



Мал. 15. Магілёў, Камісарыяцкі зав. 17. Да 1917 г.



Мал. 16. Магілёў, вул. Карпінскага 20. 1926 г.

## Вільчыкі

Разьбяныя аздабленні канькоў будынкаў у выглядзе элементаў, што выступаюць зверху над франтонам ці звісаюць з яго вільчыка, у час натурных даследванняў 2019 г. зафіксаваны толькі адзін раз на дастаткова познім будынку (1953 года пабудовы). Ён ўяўляе сабой прымітыўна апрацаваную звісаючую дошку і відавочна не адлюстроўвае нейкіх выразных уяўленняў аб ўжываным у Магілёве такім тыпе разьбяных аздабленняў драўлянай архітэктуры. Іншыя прыклады разьбяных аздабленняў, што звісаюць з вільчыка

будынку, двойчы былі зафіксаваны на фотаздымках Магілёва пачатку ХХ ст., але якасць гэтых здымкаў не дазволіла разгдедзіць нейкія іх падрабязнасці.

Таксама на фотаздымках пачатку ХХ ст. пару разоў адзначаны і варыянт разьбянога вільчыка, выступаючага над дахам, але якасць




Мал. 17. Фрагмент абмернага чарцяжа дома 1901 г. пабудовы па Пішчыкаву перавулку ў Магілёве. LVIA. F.544,Ap. 1, B. 18365, S. 1



Мал. 18. Будынак на вуліцы Міронава. Пачатак ХХ ст. Фотаздымак з асабістай калекцыі А.-Д. Лісоўскага (г. Аўгсбург, Германія)

здымкаў таксама не дазволіла зрабіць нейкія ўяўленні пра выкананне і ўжыванне гэтага аздаблення. Яшчэ адзін варыянт аздаблення ў выглядзе разьбянога шпіля на вільчыку будынка схематычна намаляваны на абмерным чарцяжы дома 1901 г. пабудовы па Пішчыкаву перавулку ў Магілёве, які захаваўся ў матэрыялах архіўнай справы ў Літоўскім нацыянальным гістарычным архіве[4] (мал. 17, 18). Не гледзячы на схематычнасць малюнка, адлюстраваны вільчык у цэлым лёгка ідэнтыфікуецца па аналогіі з вільчыкамі падобнага выканання і вядомых па будынках таго часу ў іншых гарадах – вертыкальны шпіль, квадратны ў сячэнні і фігурна апрацаваны, які для большай трываласці мацавання на даху ў ніжняй сваёй частцы падтрымліваецца двума дошкамі, апрацаванымі скразяной разьбой расліннага малюнка.

Адзіны добра "чытаемы" варыянт вільчыка-шпіля зафіксаваны на нямецкім фотаздымку 1941–1944 гг. (мал. 18), але ён відавочна ідзе ў звязцы з аздабленнямі прасторы франтона складанымі кампазіцыямі з пераплеценых рэяк, таму будзе разгледжаны ніжэй.

## Аб'ёмныя канструкцыі з пераплеценых рэяк ў полі франтона

Асобным тыпам аздабленняў верхняй часткі будынка з'яўляюцца нешматлікія зафіксаваныя прыклады складаных прасторавых кампазіцый, выкананых з пераплеценых рэяк (мад. 18, 19, 20). Большасць зафіксаваных прыкладаў будынкаў з такім драўляным архітэктурным дэкорам павязаны з чыгункай – прыстанцыйныя павільёны, жылыя дамы чыгуначнікаў і да т.п. Верагодна з'яўленне такога віду аздабленняў звязана з будаўнічым стылям чыгункі і, у канечным выніку, узыходзіць да распаўсюджанага ў Прыбалтыйскіх рэгіёнах бэлечнага дэкору каркасных будынкаў.

---

[4] Lietuvos valstybes istoryjos archyvas (LVIA), f. 544, a. 1, b. 18365, p. 1.



Мал. 19. Магілёў, вул. Першамайская 92. Каля 1902 г.



Мал. 20. Фрагмент паштоўкі з відам прыстані г. Магілёва пачатку XX ст. Паштоўка з асабістай калекцыі А.-Д. Лісоўскага (г. Аўгсбург, Германія)

У час натурных збораў 2019 г. былі зафіксаваны толькі два будынкі, франтоны якіх аздоблены падобным тыпам дэкора – два аднолькавыя жылыя дамы для чыгуначных рабочых, узведзеных каля 1902 г. (мал. 19). Аднак абодва будынкі былі ў апошнія гады абкладзены сілікатнай цэглай, што цяпер не дае выразнага разумення аб іх першапачатковым дэкаратыўным афармленні.

У франтоне будынкаў змешчана складаная аб’ёмная кампазіцыя ў прасторы паміж шчытом і дыяганальнымі краямі надвісаючага даха, якая ўтворана пераплеценымі дыяганальнымі і вертыкальнымі драўлянымі рэйкамі, квадратнымі ў сячэнні, аздобленымі фаскамі і фігурна апрацаванымі канцамі. Мяркуючы на аналогіях, першапачаткова вертыкальная рэйка выступала над франтонам будынка ў выглядзе фігурнага шпіля, які пры чарговым рамонце даху быў знішчаны. Ніжнія канцы дыяганальных рэяк франтона скульптурна апрацаваны, такім жа чынам аздоблены і ніжнія канцы крокваў пад звесам даха па перыметры абодвух будынкаў. Сваёй скульптурнай формай такое аздабленне пераклікаецца таксама і з аздабленнем адпаведных элементаў у традыцыйнай народнай архітэктуры. Дзве трохвугольныя прасторавыя ячэйкі, утвораныя ў месцы перасячэння рэяк, запоўнены філёнкай з геаметрычным малюнкам.

Найбольш дасканалым выяўленым прыкладам такога “прыбалтыйскага” дэкаратыўнага разьбянога аздаблення з пераплеценых рэяк і спадарожных ім элементаў з’яўляецца будынак на вуліцы Міронава, зафіксаваны на нямецкім фотаздымку 1941–1944 г. (гл. мал. 18). На яго франтонах перасечаныя рэйкі ўтвараюць шматлікія ячэйкі розных абрысаў, якія запоўнены філёнкамі, у тым ліку з складанымі разьбянымі раслiннымі выявамі. Дадзены будынак дэманструе не толькі рэдкі зафіксаваны прыклад ужывання вільчыкаў-шпіляў у архітэктуры Магілёва, але і адзіны выяўлены ў гэтым горадзе прыклад выкарыстання тэхнікі сілуэтнай разьбы ў стварэнні кампазіцый, змешчаных у трохвугольных ячэйках паміж пераплеценымі рэйкамі. Ніжнія з гэтых сілуэтных выяў сваім контурам перагукваюцца з выявамі на вышэйразгледжаных жылых дамах чыгуначнікаў па вуліцы Першамайскай 90 і 92.

Блізкія пералічаным прычыгуначным будынкам варыянты дэкаратыўнага аздаблення з пераплеценых рэяк характэрны таксама і для разьбянога дэкору шэрага публічных збудаванняў Магілёва – разнастайных павільёнаў, у тым ліку на гарадской прыстані і гарадскім саду Дэмбавецкага (мал. 20). Усе яны не захаваліся да нашага часу і вядомы толькі па фотаздымках пачатку XX ст. У афармленні гэтых збудаванняў адавочнай рысай з’яўляецца падкрэсленая празмерная дэкаратыўнасць, нават святочнасць, шырокае ўжыванне прапільных падзораў і іншых элементаў, якія малаўласцівы мясцовай магілёўскай драўлянай архітэктуры і з’явіліся відавочна пад уплывам сталічных праектаў у “рапетаўскім” стылі.

## Скульптурная апрацоўка канструкцыйных элементаў

Для адводу дажджавых сцёкаў ніжні край даху драўляных будынкаў максімальна выносіўся ад сцен. Гэтая надвісаючая канструкцыйная частка даху заўжды была ў полі зроку і патрабавала свайго афармлення. У абсалютнай большасці выпадкаў яна знізу падшывалася дошкамі, часам яе край афармляўся разьбянымі падзорамі ці



Мал. 21. Магілёў, вул. Садовая 25. Да 1917 г.



Мал. 22. Магілёў, вул. Першамайская 92. Каля 1902 г.

карнізамі, аб чым пісалася ўжо вышэй. Аднак у шэрагу зафіксаваных будынкаў Магілёва гэтае месца не мае дашчатай падшыўкі, а дэкаратыўнае аздабленне тут утвараюць ніжнія выступаючыя канцы кроквaў, якія скульптурна апрацоўваліся ў выглядзе акруглых фігур рознай складанасці і прапрацоўкі (мал. 21). Такое аздабленне цалкам адпаведнае афармленню гэтых жа месцаў у традыцыйнай народнай драўлянай архітэктуры, а таксама часткова перагукваецца з афармленнем ніжніх канцоў кроквaў на будынках, франтоны якіх упрыгожаны кампазіцыямі з пераплеценых рэяк (мал. 22).

## Дэкор сцен

Важным элементам стварэння прывабнага вобразу драўлянага будынка з’яўляецца дэкаратыўнае афармленне яго сярэдняга ўзроўня – сцен. Гэтая частка будынка паміж дахам і падмуркам

знаходзіцца непасрэдна на візуальным і фізічным узроўні самога чалавека, часта ў непасрэдным кантакце з ім.

## Абшыўка сцен

З глыбокай старажытнасці традыцыйным і найбольш пашыраным для будаўніцтва драўляных дамоў усходняй Беларусі матэрыялам з'яўляецца сасновы лес, які выкарыстоўваўся ў асноўным выглядзе круглых у сячэнні бярвенняў даўжынёй 6–8 м. Сцены, складзеныя з такога матэрыялу, пераважна пакідаліся ў сваім натуральным выглядзе – рыфлёная паверхня, утвораная гарызантальнымі радамі бярвенняў, але таксама сцены маглі абшывацца дошкамі (шалёўкамі) – цалкам ці часткова.

Найбольш распаўсюджаным традыцыйны спосаб афармлення паверхні сцен у драўлянай архітэктуры Магілёва і ўсяго рэгіёна ў XIX – сярэдзіне XX ст. з'яўляецца простая бервяная сцяна без абшыўкі дошкамі, натуральны гарызантальны рытм і колер якой арганічна ўпісваліся ў навакольнае прыроднае асяроддзе. Менавіта такія сцены драўляных будынкаў Магілёва бачны на малюнку А.Бусырскага сярэдзіны XIX ст., на іх няма ніякіх элементаў абшыўкі сцен дошкамі, нават карнізаў (мал. 23). Блізкія да іх прыклады зафіксаваны і ў 2019 г. у Магілёве. Аднак аналіз сабраных натурных матэрыялаў, а таксама выяваў на фотаздымках канца XIX – сярэдзіны XX ст. паказвае, што ў гэты перыяд на такіх бервяных сценах шырока распаўсюдзілася афармленне гарызантальнымі дошкамі лініі карніза і вертыкальнымі дошкамі вуглоў, асабліва, пры кладцы сцен у "чысты" вугал, без выступаючых вуглавых канцоў бярвенняў сцен (мал. 24). Такая абшыўка вуглоў і карніза будынка разам з лініяй цаглянага падмурка стварала своеасаблівую плоскую "раму" вакол бервяной сцяны, у цэнтры якой знаходзіліся вялікія прамавугольнікі вокнаў.

З іншага боку, тыя ж фотаматэрыялы канца XIX ст. – 1944 г. падаюць вялізную колькасць прыкладаў драўляных дамоў Магілёва,



Мал. 23. Фрагмент малюнка Аляксандра Бусырскага з відам г. Магілёва. 1850 г.



Мал. 24. Магілёў, Ленінградскі зав. 7. Да 1917 г.

сцены якіх абшыты дошкамі. У час збору натурных матэрыялаў у 2019 г. таксама была зафіксавана пэўная колькасць будынкаў з бясспрэчнымі прыкладамі старой абшыўкі сцен, зробленай, прынамсі, у першай палове XX ст., у тым ліку і на прыкладах ранніх дамоў, узведзеных, верагодна, яшчэ ў канцы XIX ст. Адсутнасць “дакументальнага” пацверджання ўзросту шалёкі сцен на сучасных існуючых будынках кампенсавалася знешнімі прыкметамі – як станам сабой абшыўкі, так асаблівасцямі яе мацавання пад разьбяным дэкорам, слядамі аскепкаў бомб часоў Другой сусветнай вайны ці фотаздымкамі гэтых жа будынкаў перыяду 1941–1944 г.

Прыклады будынкаў са старой абшыўкай сцен дэманструюць тры асноўныя варыянты яе размяшчэння:

– суцэльная зашыўка гарызантальнымі дошкамі;

– двухрадная зашыўка, у якой ніжні рад (ніжэй узроўню падваконняў) складзены з кароткіх вертыкальных, а верхні з доўгіх гарызантальных дошак;

– трохрадная зашыўка, у якой ніжні падаконны і верхні надаконны (але змешчаны ніжэй за карніз) рады выкананы з кароткіх вертыкальных, сярэдняя частка з гарызантальных дошак.

Абшыўка сцен дошкамі звязана як з імкненнем абараніць іх ад знешняга ўздзеяння ападкаў і прамярзання, так і з імкненнем надаць усяму драўлянаму будынку падабенства з каменнай архітэктурай. Самую шырокую распаўсюджанасць абшыўка знешніх паверхняў сцен дошкамі набыла ў другой палове XX ст., што было звязана з значным паляпшэннем матэрыяльнага становішча жыхароў у перыяд пасляваеннага аднаўлення краіны. У гэты перыяд яна набывае таксама і шырокую і варыятыўнасць – выкладка з дошак абшыўкі розных геаметрычных фігур, вулучэнне колерам і г.д. У дадзенай працы абшыўка сцен дошкамі ў перыяд другой паловы XX ст. не ўваходзіць у тэму даследвання.

## Карніз

Карніз будынка знаходзіцца ў месцы перасячэння плоскасці сцяны і надвісаючага края даху, адпавядае антаблементу ў класічнай архітэктуры. Звычайна ён уяўляе сабой шырокую паласу (фрыз) у верхняй частцы сцяны і з’яўляецца пераходным элементам паміж дэкаратыўным адзабленнем сцен і даха (франтона) будынка.

Найбольш архаічны варыянт традыцыйнага дома дадзенага рэгіёну ўвогуле не меў ніякага варыянта падшыўкі месца судакранання верха сцяны і надвісаючага края даха, што добра бачна на малюнку А.Бусырскага 1850 г. У матэрыялах з натурных збораў 2019 г. такі варыянт зафіксаваны ўсяго два разы, што сведчыць аб яго малай распаўсюджанасці ў даследваны перыяд.

Усе карнізы Магілёва можна падзяліць на чатыры тыпы, розніца паміж якімі заключаецца ў выкарыстанні розных канструкцыйных элементаў і ў ствараемым мастацка-дэкаратыўным вобразе.

І тып – “просты карніз” (мал. 25). Такі тып карніза ўяўляе сабой простую абшыўку верха сцяны гарызантальнымі дошкамі (звычайна двума, але сустракаюцца варыянты, выкананыя з адной ці трох дошак), якія ўтвараюць невялікі прамавугольны аб’ём уверсе сцяны. На такім карнізе няма якога-небудзь дэкаратыўнага




Мал. 25. Магілёў, вул. Герцана 20. 1927 г.




Мал. 26. Магілёў, вул. Валадарскага 9. Да 1917 г.

аздаблення, ён з'яўляецца самым простым у выкананні і, мяркуючы па ўсім, прататыпам для з'яўлення ўсіх астатніх тыпаў разьбяных карнізаў. Такі тып карніза найбольш распаўсюджаны ў Магілёве даследванага перыяду.

II тып – "карніз з накладным гарызантальным дэкорам" (мал. 26). Гэты тып карніза з'явіўся ў выніку развіцця карнізаў I тыпу за кошт ужывання накладнога дэкора з доўгіх гарызантальных паяскоў, апрацаваных краявой, вараткоўай ці скразяной разьбой у выглядзе розных варыянтаў раслінна-геаметрычных арнаментаў.

III тып – "карніз з састаўным вертыкальным дэкорам" (мал. 27, 28). Гэты тып карніза таксама з'яўляецца новым этапам развіцця карнізаў I тыпу, але за кошт размяшчэння на ім састаўнога шэрага з вертыкальных дошак-звёнаў апрацаваных краявой ці прапільной разьбой. Дадатковай дэкаратыўнасці такім карнізам надаюць накладныя гарызантальныя разьбяныя паясы, рытмічнасці – вертыкальныя накладныя рэйкі. Пры гэтым гарызантальныя паясы могуць размяшчацца як на верхнім краі карніза, так і на ніжнім і нават пасярэдзіне.

Вертыкальныя дошкі-звёны карнізаў гэтага тыпу сваёй формай, месцам размяшчэння і дэкаратыўным малюнкам звычайна цалкам супадаюць з апрацаванымі разьбой ніжнімі канцамі дошак вертыкальнай зашыўкі шчытоў будынкаў Магілёва, а ў шэрагу за-



Мал. 27. Магілёў, вул. Севастопальская 10. 1910 г.



Мал. 28. Магілёў, вул. Мікалуцкага 18. 1920-я гг.

фіксаваных выпадкаў ўтвараюць з імі адзіны суцэльны разьбяны дэкаратыўны пояс уверсе сцяны па ўсяму перыметру дома.

Разьбяныя карнізы III тыпу з’яўляюцца адной з выразных яркіх асаблівасцяў драўлянага разьбянога архітэктурнага дэкора Магілёва. Сваёй формай, разьбяным малюнкам, тэхнікай выканання і ўтвараемым мастацка-дэкаратыўным эфектам яны амаль цалкам адпавядаюць састаўным разьбяным падзорам, якія шырока прадстаўлены ў ніжнепасожскай традыцыі, размешчанай на поўдні, у Гомельскім Пасожжы, і амаль неўжываныя ў драўлянай архітэктуры Магілёва, фактычна замяняючы іх і выконваючы тую самую мастацка-дэкаратыўную функцыю.

Па канструкцыйных асаблівасцях стварэння мастацка-дэкаратыўнага вобразу разьбяныя карнізы III тыпу дзеляцца на два ўстойлівыя выразныя падтыпы.

1-ы падтып (мал. 27). Да яго адносяцца карнізы з вертыкальных дошак-звёнаў, у якіх накладнымі гарызантальнымі разьбянымі паясамі выразна вылучаецца шырокі фрыз, з падкрэсленым вертыкальным рытмам.

2-гі падтып (мал. 28). Да яго адносяцца карнізы, у якіх малюнак вертыкальных дошак-звён прадстаўляе выразныя, звісаючыя ўніз раслінныя парасткі, а гарызантальныя разьбяныя палосы на карнізе змешчаны выключна ў яго верхняй частцы.

## Аконныя ліштвы

Элементам дома на ўзроўні сцен будынка, які адыгрывае важную ролю ў стварэнні яго яркага і выразнага вобраза, з’яўляюцца вокны, асабліва аздобленыя разьбянымі ліштвамі. Аднак на гравюрах і малюнках з відамі забудовы г.Магілёва, зробленымі ў XVIII – сярэдзіне XIX ст. не адзначана ніякіх прыкмет ужывання ліштваў на вокнах. Аконныя ліштвы стабільна фіксуюцца толькі ў візуальных матэрыялах з канца XIX ст.

Усе варыянты афармлення вокнаў г. Магілёва можна падзяліць на пяць асноўных тыпаў разьбяных ліштваў і шэраг іх падтыпаў, а таксама асобна можна вылучыць адзін устойлівы спосаб афармлення вокнаў, так бы мовіць “протатып”, які канструкцыйна ўвогуле нельга аднесці да тыпалогіі разьбяных ліштваў (з-за іх адсутнасці), але ён з’яўляецца найбольш распаўсюджаным у гэтым горадзе. У цэлым, тыпалогія магілёўскіх ліштваў цалкам адпавядае раней апісанай тыпалогіі ліштваў паўднёва-ўсходняй Беларусі канца XIX – першай паловы XX ст.[5], але мае шэраг сваіх спецыфічных рэгіянальных варыянтаў, не характэрных для больш паўднёвых тэрыторый.

“Протатып” – лудка (мал. 29). Адным з галоўных і найбольш пашыраных варыянтаў афармлення вокнаў на драўляных дамах г. Магілёва ў канцы XIX – сярэдзіне XX ст. з’яўляецца адсутнасць любой, нават самай мінімальнай, ліштвы вакол акна – драўляная лудка вакол аконнай рамы непасрэдна ўстаўленая ў праём бервяной сцяны, выступаючая на 10-15 см ад плоскасці сцяны. Ад зацякання ападкаў такая ліштва-лудка зверху прыкрывалася аднасхільнай дошкай-стрэшкай, для большай трываласці моцна выступаючы аб’ём кораба знізу дадаткова ўмацоўваўся двума ўпорамі-кранштэйнамі.

Нягледзячы на сваю відавочную прымітывізну і дэкаратыўную неэстэтычнасць, такое афармленне акна адно з найбольш распаўсю-

[5] Я.Р. Малікаў, *Традыцыі разьбянога дэкору ў народнай архітэктуры паўднёва-ўсходняй Беларусі : канец XIX – першая палова XX ст.,* Мінск 2016, с. 215–218.



Мал. 29. Магілёў, вул. Ленінская 83А. Да 1917 г. Дом знесены ў 2023 г.



Мал. 30. Магілёў, вул. Струшня 14. Да 1917 г.

джаных у драўлянай архітэктуры Магілёва нават у другой палове XX ст., з’яўляецца яго выразнай асаблівасцю. Улічваючы, што такія ліштвы-лудкі заўжды вельмі далёка выступаюць ад плоскасці сцяны, можна выказаць гіпотэзу, што яны выконваліся з разлікам на будучую(?) абшыўку сцен дошкамі. Такія ж прыклады афармлення вокнаў зрэдку фіксуюцца таксама ў драўлянай архітэктуры некаторых іншых даследваных гарадоў Магілёўскай вобласці, а таксама ў Смаленску.

I тып – “ліштвы-абрамленні” (мал. 30).

Адным з самых распаўсюджаных тыпаў разьбяных ліштваў у Магілёве з’яўляецца размяшчэнне па перыметры акна рамкі з чатырох дошак-шалёвак, звычайна прафіляваных. У пераважнай большасці выпадкаў гэта раўнамерная прамавугольная рамка, аднак на фотаздымках перыяду 1941–1944 гг. таксама зафіксаваны падтып такой ліштвы з паўкруглым афармленнем надаконнай дошкі. У час

натурных збораў фотаматэрыялаў ў 2019 г. такая паўкруглая зверху ліштва ў Магілёве была зафіксавана толькі аднойчы.

II тып – “карнізныя ліштвы” (мал. 31).

Яшчэ адным з найбольш пашыраных у Магілёве з’яўляецца варыянт ліштвы з нескладаным разьбяным дэкорам у выглядзе невысокага прафіляванага карніза ў надаконніку. Паміж карнізам і верхнім краям аконнага праёма звычайна знаходзіцца пашыраная частка надаконніка – лабавая дошка, на якой часам размешчаны нескладаныя накладныя кампазіцыі геаметрычнага характару (складаных кампазіцый з раслiннымі матывамі не зафіксавана). Важнай асаблівасцю гэтага тыпу ліштваў з’яўляецца наяўнасць, як правіла, выступаючых за лінію падаконніка ніжніх канцоў бакавін (абакеннікаў), што надае ліштве выразную вертыкальна выцягнутую кампазіцыю.



Мал. 31. Магілёў, Семафорны завул. 5. 1935 г.



Мал. 32. Магілёў, вул. Катоўскага, 158. Да 1917 г.

III тып – “франтонныя ліштвы” (мал. 32).

Гэты тып ліштваў з’явіўся ў выніку ўскладнення надаконнікаў ліштваў карнізнага тыпу, за кошт пад’ёма лініі вянчаючага карніза ў сярэдняй частцы і ўтварэння вялікага, гарызантальна непадзеленага франтона і двух плечыкаў абапал яго. Асобна выдзелены ярус лабавой дошкі ў такіх ліштвах адсутнічае, а яе функцыі выконвае ўся прастора франтона паміж карнізам і верхнім краям аконнага праёма, якая запаўняецца разьбянымі накладнымі элементамі – пояскамі, геаметрычнымі і раслiннымі фігурамі разнастайнага малюнка. Ніжняя падаконная частка ліштваў гэтага тыпу таксама часта мае распрацаванае афармленне ў выглядзе ніжніх канцоў бакавін, паміж якімі змешчана контурна апрацаваная карона падаконніка, звычайна плаўнага хвалістага абрысу.

Некалькі такіх ліштваў зафіксаваны на рэдкіх датаваных будынках 1890-х гг. пабудовы, што сведчыць аб іх дастаткова ранняім з’яўленні ў разьбяным архітэктурным дэкоры Магілёва. Аднак гэта не адмяняе і той факт, што статыстычна гэта вельмі рэдкія разьбяныя ліштвы. У з’яўленні такога тыпу ліштваў відавочна сказваецца ўплыў архітэктурнай стылістыкі барока і класіцызму.

IV тып – “стрэшкавыя ліштвы” (мал. 33). Ліштва гэтага тыпу мае надаконную частку з шырокай лабавой дошкай, якая па баках абмежавана двума фігурнымі кранштэйнамі, над лабавой дошкай змешчаны выразны прафіляваны і раскрэпаваны на краях карніз, над ім змешчаны трохвугольны франтон пад строгай двухсхільнай стрэшкай. На лабавой дошцы надаконніка змешчана плоская накладка знака “ромба-стралы” расліннага характару, у цэнтры якой аб’ёмны скульптурны элемент у выглядзе салярна-кветкавай разеткі. Абапал аконнага праёма змешчаны двайныя філянговыя аканіцы. Ніжняя падаконная частка ліштвы мае апрацаваныя разьбой канцы абакеннікаў у выглядзе трайных кутасаў, паміж якімі змешчана падаконная карона плаўнага хвалістага абрысу, плоскасць якой апрацавана глухой (рэльефнай) разьбой.



Мал. 33. Магілёў, вул. Ніжняя Карабанаўская 2. 1900 г.



Мал. 34. Магілёў, вул. Завадская 64. Да 1917 г.

Ліштвы гэтага тыпу абсалютна неўласцівы для даследванай часткі Магілёўскай вобласці, тэрыторыя іх шырокага бытавання знаходзіцца значна паўднёвей, яны з’яўляюцца адной з характэрных і выразных асаблівасцяў ніжнепасожскай традыцыі архітэктрнага дэкору, “эпіцэнтрам” іх бытавання з’яўляецца Гомель, зафіксаваны яны таксама ў гарадах Рагачове, Рэчыцы, якія знаходзяцца на на рацэ Дняпро.

У Магілёве ўжыванне такога тыпу ліштваў было зафіксавана толькі адзін раз на доме 1900 г. пабудовы (дзве штукі). У Гомелі ліштвы такога тыпу адносяцца да найбольш ранніх разьбяных ліштваў, якія шырока фіксуюцца ў матэрыялах 1860-1900-х гг. Звяртае ўвагу афармленне падаконнай часткі магілёўскай ліштвы (канцы абакеннікаў і карона паміж імі), якое амаль ідэнтычнае афармленню гэтага ж месца і элементаў на ліштвах гомельскага

дома 1880 г. пабудовы па вул. Парыжскай камуны 11, альбо часткова (канцы абакеннікаў) на ліштвах дома 1860 г. пабудовы на вул. Партовая, 9.[6] Пералічаныя факты могуць сведчыць аб больш ранняй пабудове і магілёўскага дома з такім тыпам ліштваў, чым афіцыйна ўказаны 1900 г., а таксама аб іх "імпарце" з рэгіёна Гомеля.

V тып – "каронкавыя ліштвы" (мал. 34–36).

Да гэтага тыпу ліштваў адносіцца шэраг разнастайных, часта нават адзінкавых зафіксаваных экзэмпляраў, якія, за рэдкім выключэннем, у выяўленых матэрыялах г.Магілёва не ўтвараюць стабільных, шматразова ўжываных і фіксаваных варыянтаў (у адрозненне ад вышэй пералічаных ліштваў I-III тыпаў), а аб'ядноўваюцца выключна тэхналагічнай агульнасцю канструкцыі надаконніка.

Ліштвы гэтага тыпу ў надаконніку маюць выразны гарызантальны карніз рознага ўзроўню складанасці і тэхнікі выканання, пад якім змешчана шырокая лабавая дошка з накладнымі разьбянымі элементамі альбо без іх. Над карнізам надаконніка змешчаны розныя варыянты разьбяной кароны – ад вельмі складаных, выкананых у тэхніцы скразяной разьбы, да вельмі прымітыўных, у выглядзе дошкі-стрэшкі трапецыяпадобнай формы. Наяўнасць той ці іншай разьбяной кароны над карнізам надаконніка з'яўляецца галоўнай і адрознай асаблівасцю ліштваў гэтага тыпу, якая і стварае іх мастацка-дэкаратыўны вобраз. Падаконная частка ліштваў можа быць аформлена простым прафіляваным карнізам альбо апрацаванымі ніжнімі канцамі абакеннікаў, паміж якімі змешчана падаконная карона плаўных абрысаў. Па баках ліштвы могуць быць змешчаны аканіцы, зрэдку разьбяное аздабленне ў тэхніцы скразяной разьбы, прыбітае збоку планак абакеннікаў, у прасторы сцяны (мал. 36).

[6] Я.Р. Малікаў, *Традыцыі разьбянога дэкору ў народнай архітэктуры паўднёва-ўсходняй Беларусі: канец XIX – першая палова XX ст.,* Мінск 2016, с. 66, 68, 113.



Мал. 35. Магілёў, вул. Струшня, 15. Да 1917 г.



Мал. 36. Магілёў, вул. Садовая 25. Да 1917 г.

Статыстычны падлік колькасці зафіксаваных тыпаў ліштваў Магілёва паводле розных крыніц (фотаздымкі канца XIX – сярэдзіны XX ст. і фотабаза сабраная ў час натурных экспедыцый у 2019 г. – агулам 541 будынак з пазнаваемымі ліштвамі) далі наступныя прыблізныя працэнтныя суадносіны іх распаўсюджання:

– аконная лудка без ліштвы – 28 % (150 шт.),

– “ліштвы-абрамленні” – 28 % (147 шт.),

– “карнізныя ліштвы” – 29 % (157 шт.),

– “франтонныя ліштвы” – 10 % (52 шт.),

– “каронкавыя ліштвы” – 5 % (31 шт.).

Трэба адзначыць, што каля палова “франтонных” і “каронкавых” ліштваў былі зафіксаваны на будынках, узведзеных у 1945-1959 гг.

Безумоўна, гэтыя лічбы не могуць служыць дакладным працэнтным адлюстраваннем колькасці ўжываных у Магілёве розных тыпаў ліштваў у канцы XIX – сярэдзіне XX ст., але ў цэлым яны даюць выразнае ўяўленне аб дамінуючых тыпах ліштваў у драўляным дойлідстве г.Магілёва канца XIX – сярэдзіны XX ст.

## Аканіцы

Падчас натурных збораў матэрыялаў у 2019 г. была зафіксавана вельмі нязначная колькасць дамоў г.Магілёва, аконныя ліштвы якіх мелі аканіцы ці сляды ад іх ужывання – каля паўтара-двух дзясяткаў, што складае каля 5-6 % ад агульнай колькасці ў 366 зафіксаваных драўляных будынкаў. На старых фотаздымках канца XIX – першай паловы XX ст. было выяўлена 260 драўляных будынкаў у якіх атрымалася прасачыць наяўнасць ці адсутнасць аканіц на вокнах, з іх 42 дамы мелі аканіцы, што складае каля 16% ад агульнай колькасці прааналізаваных. Гэта сведчыць, што абсалютная большасць драўляных будынкаў Магілёва канца XIX – сярэдзіны XX ст. не мелі аканіц на аконных ліштвах – такі спосаб засцярогі вокнаў не з'яўляўся абавязковым для драўляных будынкаў гэтага горада.

Большасць зафіксаваных у натурных матэрыялах 2019 г. аканіц ўяўляюць сабой дзвюхстворкавыя аканіцы, складзеныя з дзвюх прамавугольных філёнак, што прасочана таксама і пры аналізе старых фотаздымкаў канца XIX ст. – 1944 гг. Адным экзэмплярам зафіксавана ўжыванне аднастворкавай аканіцы ў выглядзе шырокага шчыта з некалькіх вузкіх дошак, яшчэ некалькімі прыкладамі – дзвюхстворкавыя аканіцы збітыя з цэльных дошак (не філянговыя). Толькі на адным будынку 1957 г. зафіксаваны прыклад ліштвы, аканіцы якой маюць тры філёнкі.

Нешырокае ўжыванне аканіц сталася адной з прычын распаўсюджанага ў Магілёве разьбянога адзаблення сярэдняй часткі абакеннікаў на ўзроўні акна. Менавіта адсутнасць аканіц дазволіла актыўней аздабляць разьбой гэтую частку ліштваў, бо такое дэкаратыўнае рашэнне было б небачнае днём пры адкрытых аканіцах, альбо яго накладныя элементы перашкаджалі б увогуле іх адчыняць. Таксама відавочна існуе сувязь паміж нешырокім распаўсюджаннем у Магілёве аканіц на вокнах драўляных будынкаў і шырокім распаўсюджаннем самых сціплых варыянтаў афармлення вокнаў ліштвамі.

## Вуглы

Яшчэ адным месцам размяшчэння разьбянога дэкору на драўляных будынках Магілёва з'яўляюцца вуглы. Найбольш раннія зафіксаваныя вуглы драўляных будынкаў прадстаўлены на гравюрах і малюнках пачатку – сярэдзіны XIX ст., на якіх паказаны традыцыйныя для беларускай архітэктуры драўляныя будынкі, сцены якіх складзены з круглых бярвенняў у вуглы "з астаткам" – з выступаючымі за плоскасць сцяны канцамі бярвенняў зруба, якія ніяк не абшываліся. Шматлікія прыклады такога афармлення вуглоў былі зафіксаваны і ў час натурных збораў матэрыялаў у 2019 г. У далейшым, пад уплывам еўрапейскай і каменнай архітэктуры шырокае распаўсюджанне набывае кладка сцен у "чысты вугал" – без астатка, што трохі павялічвала ўнутраную прастору будынка. У другой палове XX ст. такі спосаб афармлення вугла стане асноўным у драўлянай архітэктуры фактычна ўсёй Беларусі.

З'яўленне "чыстага" вугла патрабавала дадатковай яго абароны ад прамярзання і ападкаў, што прывяло да вертыкальнай зашыўкі яго дошкамі. Фотаматэрыялы першай паловы XX ст. сведчаць, што ўжо ў той час абшыўка вертыкальнымі дошкамі вуглаў была характэрна не толькі пры ўкладцы сцен у "чысты вугал", але і на вуглах "з астаткам".

Такая простая вертыкальная дошка-лапатка на вуглах будынка з'ўлялася выдатным полем для размяшчэння на ёй дэкаратыўных кампазіцый, асабліва пры складаным аздабленні дэкорам вокнаў, якія візуальна знаходзіліся на тым жа ўзроўні ў агульнай кампазіцыі будынка. Найбольш простым варыянтам аздаблення вуглавой лапаткі было размяшчэнне на ёй канэлюраў (мал. 37).

Найбольш распаўсюджаным варыянтам аздаблення вуглавых дошак-лапатак быў іх падзел на дзве ці тры часткі (ніжняя прыблізна да ўзроўню падаконніка, верхняя ад ўзроўня акна да карніза будынка, паміж імі большая па памерах сярэдняя частка). Але гэтыя суадносіны вытрымліваліся не заўжды, часам вуглавая лапатка



Мал. 37. Магілёў, вул. Садовая 25. Да 1917 г.



Мал. 38. Магілёў, вул. Кашанаўская 21. Да 1917 г.



Мал. 39. Магілёў, вул. Струшня 14. Да 1917 г.




Мал. 40. Магілёў, Берагавы зав. 12. Канец XIX – пачатак XX ст.

толькі візуальна дзялілася на тры часткі за кошт накладных элементаў – вертыкальных ромбаў (мал. 38), альбо ўтвораных накладной рамай вертыкальных ніш (мал. 39).

Асобным тыпам разьбяных аздабленняў вугла з'яўляецца абшыўка яго гарызантальнымі дошкамі накшталт руста (мал. 40). Такое аздабленне вугла дастаткова часта фіксуецца на старых фотаздымках, альбо ў натурных матэрыялах сабраных у 2019 г., у тым ліку на ранніх будынках, узведзеных, верагодна, яшчэ ў канцы XIX ст., але заўжды на будыкнах з ашаляванымі сценамі. Відавочна, што ў такім афармленні сцен і вуглоў драўлянага будынка знаходзіць адлюстраванне імкненне надаць яму максімальнае падабенства з каменнай прафесійнай архітэктурай.

## Дзверы

Уваход з'яўляецца важным элементам стварэння прывабнага вобраза ўсяго будынка, бо ён, у адрозненне ад астатніх частак дома, увесь час непасрэдна звязаны з фізічным узроўнем чалавека і непасрэдным кантактам з ім. Сказанае тычыцца перш за ўсё дзвярэй. Аздобленыя парадныя дзверы звычайна размяшчаліся на галоўным фасадзе будынка, у той час як дзверы з боку двара звычайна не дэкараваліся і мелі толькі функцыянальнае афармленне. Фасадныя дзверы на будынках Магілёва могуць знаходзіцца па цэнтры фасада, на адным ці сіметрычна адразу на абодвух яго краях, альбо ў спецыяльна прыбудаваных сенцах-верандзе. Першапачаткова фасадныя дзверы з вуліцы заўжды афармляліся парадным ганкам.

Найбольш часта фіксуемыя ва ўсіх выкарыстаных відах крыніц (і ў фотаматэрыялах 2019 г., і на фотаздымках канца XIX – сярэдзіны XX ст.) разьбяныя дзверы ў Магілёве ўяўляюць сабой розныя варыянты філянговых дзвярэй. Усе зафіксаваны прыклады – дзвюхстворкавыя сіметрычныя дзверы, большасць з іх мае па тры філёнкі на кожнай са створак, радзей дзве ці чатыры. Над дзвярамі часта



Мал. 41. Магілёў, вул. Севастопальская 4. 1910 г.



Мал. 42. Магілёў, вул. 2-я Чыгуначная, 8. Да 1917 г.

змешчана шкляное акно для натуральнага асвятлення прасторы за імі, альбо вялікая дошчатая дэкаратыўная кампазіцыя, часам дзве філёнкі (мал. 41–42).

Элементамі, якія ўтвараюць дэкаратыўнае аздабленне філянговых дзвярэй, з’яўляюцца самі філёнкі – іх колькасць, памеры, форма, накладныя рэйкі і паяскі вакол іх, аб’ёмныя накладныя элементы на філёнкі і раму вакол іх, а таксама аздобленая рэльефнай разьбой прытворная планка паміж створкамі.

У аздабленні філянговых дзвярэй фіксуюцца пэўныя заканамернасці. Пры ўжыванні трох філёнках на адным палатне кампазіцыя ўтвараецца вялікай у цэнтры і двума аднолькавымі меншымі па краях, альбо малай ў цэнтры і двума вялікімі аднолькавымі па краях. Але зафіксаваны таксама варыянты з трох featнапамерных філёнак. Пры ўжыванні чатырох філёнак на адным палатне – яны ўсе аднолькавыя альбо малюнак і памеры ў дзвюх з іх дублюецца.



Мал. 43. Магілёў, вул. Катоўскага 48. Да 1917 г.



Мал. 44. Магілёў, вул. 1-я Чыгуначная, 9. 1910 г.

Уласна самі філёнкі маглі аздабляцца рэльефнымі паралельнымі лініямі альбо маюць складаныя контурныя абрысы. Але найбольш пашыраным аздабленнем з'яўляюцца накладкі ў выглядзе невысокіх гранёных пірамідак альбо ромбаў. Шэраг аднатыпных дамоў на вуліцы Чугуначнай, пабудаваных у самым пачатку XX ст., маюць амаль ідэнтычныя дзверы, аздобленыя невялікімі геаметрычнымі разеткамі, точанымі на такарным станку ў выглядзе дыска (мал. 44).

## Ганкі

Ганак з'яўляецца важным і звычайна самым заўважным элементам афармлення ўваходнай групы дома. На выявах XVIII – пачатку XIX ст. канструкцыйна афармленыя ганкі на драўляных будынках не выяўлены, уваход у іх паказаны непасрэдна з вуліцы ў дзверы. Аднак на малюнку А.Бусырскага 1850 г. паказаны ўжо нават тры ганкі

на невялікім фрагменце гарадской забудовы – усе ганкі слупавыя, два з аднасхільнай стрэшкай, адзін з двухсхільнай. Ганкі на гэтым малюнку паказаны досыць схематычна, без дэталяў, але можна заўважыць, што слупы ганкаў нагадваюць круглыя драўляныя калоны з схематычна прамаляванымі “базамі” і “капітэлямі”. У франтоне двухсхільнага ганка таксама паказана прамавугольная адтуліна, верагодна ікона. Не выклікае сумневаў, што гэта самыя раннія і архаічныя варыянты разьбяных ганкаў Магілёва, але прыведзены малюнак А.Бусырскага з’яўляецца і адзіным прыкладам іх ранняй фіксацыі.

Большасць зафіксаваных прыкладаў разьбяных ганкаў Магілёва адносіцца да канца XIX – сярэдзіны XX ст. Усе зафіксаваныя ў Магілёве разьбяныя ганкі выразна дзеляцца на тры тыпы.

І тып – “ганкі слупавыя” (мал. 45). Гэтыя ганкі маюць вынас вялікай двухсхільнай страхі з зашытымі дошкамі шчытом і столяй, якая абапіраецца на два ці чатыры слупы. Такія ганкі нячастыя ў Магілёве, зафіксаваны па адному разу на фотаздымках пачатку XX ст. і 1941–1944 г., два прыклады зафіксаваны ў час натурных збораў 2019 г.



Мал. 45. Магілёў, Ветраны зав. 3. 1939 г.



Мал. 46. Магілёў, вул. Завадская 23. Да 1917 г.

II тып – “ганкі кранштэйнавыя” (мал. 46). Ганкі гэтага тыпу дастаткова часта фіксуюцца ў даследваных матэрыялах. Яны ўяўляюць сабой прымацаваную непасрэдна да сцяны складаную канструкцыю ў выглядзе каркаснага кранштэйна з квадратных у сячэнні рэяк, якія падтрымліваюць двухсхільны дах з зашытымі дошкамі шчытом і столяй.

Ганкі гэтага тыпу актыўна аздабляліся разьбянымі падзорамі і закрылінамі, зробленымі з адной гарызантальнай дошкі альбо састаўленыя з шэрага вертыкальных звёнаў.

III тып – “ганкі паўарачныя” (мал. 47, 48). Разьбяныя ганкі гэтага тыпу самыя распаўсюджаныя ў Магілёве канца XIX – сярэдзіны XX ст. Па сваёй унутранай будове яны аб’ядноўваюць канструкцыю абодвух папярэдніх тыпаў – два слупы, адносна недалёка вынесеныя ад сцяны, да якіх уверсе дадаткова прымацаваны рэйкі-кранштэйны. Атрыманая канструкцыя абавязкова абшывалася дошкамі рознай даўжыні і шырыні, утвараючы дзве глухія паўаркі па баках ад увахода, якія моцна выступаюць ад плоскасці сцяны. Зверху над паўаркамі змешчаны аб’ём двухсхільнага даху з зашытымі дошкамі франтонам і столяй.

Ганкі гэтага тыпу адрозніваліся па сваіх вертыкальных памерах, але заўжды прыблізна аднолькавыя па шырыні, якая вызначалася шырынёй дзвярнога праёма і невялікага зазора вакол яго. Таксама такія ганкі адрозніваюцца па велічыні свайго фізічнага выступу ад сцяны – ад пары дзясяткаў сантыметраў, да больш метра, утвараюцы выразны аб’ём, які абараняў дзверы ад непагоды.

Акрамя сваёй формы мастацка-дэкаратыўны вобраз паўаркавых ганкаў таксама ўтваралі дэкаратыўныя разьбяныя элементы. Ніжняя тарцавая частка бакавых “апор” такіх ганкаў зашывалася вертыкальнай, часта з канэлюрамі, дошкай з невялікім пояском уверсе, у цэлым нагадваючы своеасаблівы “п’едыстал”. Выгіб паўаркі заўжды абшываўся кароткімі і тонкімі гарызантальнымі рэйкамі, якія дадавалі пэўны рытмічны дэкаратыўны матыў. Найбольш яркім элементам аздаблення такіх ганкаў з’яўляліся разна-



Мал. 47. Магілёў, вул. Свярдлова 24. Да 1917 г.



Мал. 48. Магілёў, вул. Карпінскага 22. Да 1917 г.

стайныя разьбяныя падзоры і паяскі, змешчаныя як па лініі карніза, так і па лініям закрылін, выкананыя як і цэльнай гарызантальнай дошкі, так састаўленыя з наборных вертыкальных звёнаў. Пры вялікіх вертыкальных памерах паўарачных ганкаў заўважна павялічваліся і памеры звёнаў звісаючых на іх састаўных падзораў.

Важнай асаблівасцю ўсіх ганкаў Магілёва, асабліва II і III тыпаў, з’яўляецца шырокае ўжыванне дадатковых разьбяных сродкаў, арсенал якіх супаставімы з выкарыстоўваемымі ў аздабленні франтонаў дахаў самога дома – звісаючыя разьбяныя падзоры і закрыліны (“цэльнадошкавыя” і “састаўныя” па канструкцыі), накладныя рэйкі і паяскі, мастацкая ўкладка шалёўкі на франтоне ганка, уключна з свабодна звісаючымі апрацаванымі разьбой ніжнімі канцамі вертыкальных дошак абшыўкі шчытоў і разьбяным аздабленнем вільчыка. Фактычна на франтонах ганкаў зафіксаваны ўсе спосабы дэкаратыўнага афармлення, якія рапаўсюджаны на франтонах да-

моў Магілёва, за выключэннем шчытавых вокнаў і падзела зашыўкі франтонаў на шэрагі (што павязана, верагодна, выключна з аб'ектыўна меншымі габарытамі). Да дэкаратыўных сродкаў адносіца таксама скульптурная апрацоўка рэяк кранштэйнавых ганкаў – прафіліроўка выступаючых канцоў, фаскі і г.д. Часта фіксуюцца выпадкі ўжывання на ганках разьбяных элементаў, выкананых па тых жа лекалах і профілях, што былі выкарыстаны ў аздабленні дахаў таго ж самага, альбо іншых дамоў г. Магілёва.

## Высновы

Падводзячы вынік разгляду драўлянага разьбянога архітэктурнага дэкора г. Магілёва канца XIX – сярэдзіны XX ст. можна пералічыць шэраг асаблівасцяў, якія вызначаюць рысы традыцыі менавіта гэтага горада, характэрны толькі для яе, альбо малаўжываныя ў дэкаратыўным аздабленні іншых даследваных тэрыторый і паселішч паўднёва-усходняй Беларусі.

Галоўным месцам дэкаратыўнага аздаблення для большасці магілёўскіх дамоў канца XIX – другой паловы XX ст. з'яўляецца тымпан франтона (шчыт), на якім змешчана пераважная колькасць ўжываных у Магілёве спосабаў аздаблення даха ўвогуле. Элементы аздаблення даха размешчаныя па-за шчытом (напрыклад, вільчыкі, падзоры і інш.) фіксуюцца рэдка, некаторыя адзінкавымі зафіксаванымі прыкладамі. У параўнанні з распрацаванасцю аздаблення шчытоў іншыя месцы дома на ўзроўні сцен (ліштвы, вуглы) значна менш аздабляліся, хаця і тут сустракаюцца выпадкі яркага дэкору, які сваім афармленнем карэлюецца з дэкорам шчыта (напрыклад, накладныя разьбяныя карнізы і паясы зверху сцен).

Найбольш раннім фіксуемым спосабам аздаблення шчыта сталі аконныя праёмы розных памераў і фігурных абрысаў, часта двайныя ці трайныя, з геаметрычным малюнкам аконнага пераплёту, рознымі па канструкцыі і малюнку разьбянымі ліштвамі. Дынаміка іх развіцця прайшла шлях ад простых геаметрычных адтулін

у шчыце, да ўжывання накладных дошак, што ўтваралі нескладаныя ліштвы вакол праёмаў. Вяршыняй аздаблення шчытавых вокнаў стала вялікая канструкцыя з выразнай геаметрычнай аб'ёмнай формай, напоўненая знутры слаямі разьбы, якія перспектыўна сходзяцца да цэнтра кампазіцыі. Трэба прызнаць, што бліжэйшай візуальнай аналогіяй утвараемаму мастацкаму-дэкаратыўнаму вобразу такой аконнай кампазіцыі з'яўляецца структура разьбянога ківота вакол іконы, з той толькі розніцай, што замест пазалочанай аб'ёмнай барочнай разьбы тут выкарыстана спрошчаная разьба па накладзеных слаямі дошках. Такія найбольш распрацаваныя і дасканалыя варыянты шчытавых ліштваў у асноўным выкарыстоўваліся на будынках 1900–1920-х гг. пабудовы. Гэтыя прыклады відавочна ўплывалі і на працу наступных пакаленняў магілёўскіх майстроў драўлянай архітэктуры, асабліва 1945–1960-х гг.

Важным і, магчыма, нават абавязковым элементам аздаблення франтонаў магілёўскіх дамоў з'яўляецца афармленне ніжніх канцоў дошак шчыта краявой ці скразяной разьбой, якая ўтварала выразны арнаментальны пояс ў раёне карніза сцяны – ніза франтона.

Малюнак зашыўкі дошкамі шчыта таксама адыгрывае пэўную ролю ў аздабленні франтона, але ў параўнанні з іншымі элементамі значэнне гэтага віду аздаблення меншае, носіць падпарадкаваны характар. Прасочваецца агульная тэндэнцыя да ўскладнення малюнкаў абшыўкі шчытоў ад дамінуючай простай вертыкальнай ў канцы XIX – самым пачатку XX ст., да шырокага ўжывання шматраднай кампазіцыі і накладных элементаў з ромбаў, квадратаў, салярных разетак і крыжоў у сярэдзіне XX ст.

Трэба заўважыць, што дэкаратыўнае афармленне ніжніх канцоў абшыўкі шчыта і ўвесь разьбяны зігзагавы пояс у нізе шчыта ў цэлым адпавядаюць значэнню састаўных падзораў дахаў будынкаў, напрыклад, г.Гомеля канца XIX – пачатку XX ст., але выканана і размешчана яно зусім іншым канструкцыйным спосабам. Агульная кампазізыя такіх вертыкальных разьбяных звёнаў паўтарае агульную кампазіцыю на састаўных падзорах гомельскіх дамоў

(звісаючы ўніз складаны “расток”, выкананы ў тэхніцы краявой ці прапільной разьбы), але непасрэдна самі малюнкі гэтых “расткоў”, а дакладней лекала-шаблоны выкарыстаныя ў Магілёве, не маюць ніякіх адпаведнасцяў у драўляным дэкоры дахаў Гомеля і ўсёй паўднёва-ўсходняй Беларусі, яны з’яўляюцца цалкам самабытнымі. Тое самае можна сказаць і ў выпадку ўжывання гарызантальных дошак апрацаваных разьбой для аздаблення гэтага месца.

Найбольшай выкшталцоўнасцю і гарманічнасцю вылучаюцца разьбяныя паяскі, выкананыя на дамах Магілёва пачатку XX ст. у тэхніцы скразяной разьбы. Заўважана, што на будынках 1920–1930-х гг. пабудовы і нават пазней, працягвалі ўжывацца паяскі, выкананыя па лекалах папярэдняга часу, але пры гэтым адчуваецца агульная прымітывізацыя тэхнікі разьбы, у першую чаргу за кошт фіксуемага колькаснага павелічэння ўжывемых простых геаметрычных форм, якія лёгка выконваліся самымі нескладанымі інструментамі і не патрабавалі асаблівых навыкаў. Відаць гэта было звязана з агульным збядненнм насельніцтва ў перадваенныя гады і значнай міграцыяй ў гарады выхадцаў з вёсак, густы якіх адрозніваліся выразнай сціпласцю. Аднак на будынках 1950–1960-х гг. шырока распаўсюджаны лепшыя з варыянтаў пачатку XX ст., што звязана з значным паляпшэннем агульнага матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва ў адзначаны пасляваенны перыяд. Безумоўна, шырокае выкарыстанне ў Магілёве разьбяных накладных паяскоў і акантовак на шчыце будынка дадаткова павялічвала агульную завышаную дэкаратыўнасць яго аздаблення, якая і стала адрознай рысай драўлянай архітэктуры гэтага горада.

У гэты ж час важна адзначыць, што найбольш складаныя і яркія з мастацка-дэкаратыўнага пункту гледжання варыянты такіх аздабленняў даху – састаўныя разьбяныя падзоры і закрыліны (у вялікай колькасці прадстаўленыя, напрыклад у суседняй ніжнепасожскай традыцыі), у Магілёве зафіксаваны адзінкавымі экзэмплярамі на жылых будынках пачатку XX ст. Але тую самую мастацка-дэкаратыўную функцыю ў стварэнні вобраза заможнага аздобле-

нага будынка, якую на хатах Гомельскага Пасожжа выконваюць саставўныя разьбяныя падзоры і закрыліны, для драўляных дамоў Магілёва выконваюць амаль абавязковыя паласы гарызантальнага арнамента, утвораныя ніжнімі разьбянымі канцамі вертыкальных дошак абшыўкі франтонаў і разьбянымі накладнымі карнізамі. Яны нават структурна паўтараюць тыя ж самыя два тыпы разьбяных падзораў (“састаўныя” і “цэльнадошкавыя” падзоры), але са сваёй спецыфікай тэхнічнага выканання. Адрозненне ў тым, што нават будучы выкананымі ў тэхніцы скразяной прапільной разьбы такія паясы на магілёўскіх будынках у большасці выпадкаў накладзены на плоскасць сцяны, з-за чаго дасягаўся відавочны меншы мастацкі эфект, бо адсутнічала аб’ёмная прасторавая кампазіцыя размяшчэння элементаў і ўласцівая ёй гульня светлаценяў, якія характэрны для аналагічных па малюнку і тэхніцы выканання разьбяных падзораў па краі навісі страхі і закрылін будынкаў на паўднёвых гомельскіх тэрыторыях даследванага рэгіёна.

Цікавай і покуль невытлумачальнай акалічнасцю з’яўляецца той выяўлены факт, што разьбяныя “састаўныя” і “цэльнадошкавыя” падзоры і закрыліны, амаль неўласцівыя схілам дахаў магілёўскіх дамоў, у гэты ж час актыўна ўжываліся ў афармленні невялікіх па памерах дахаў ганкаў над параднымі ўваходамі ў жылыя будынкі гэтага ж горада. Гэта сведчыць аб абсалютным разуменні магілёўскіх цесляроў мастацка-дэкаратыўнага патэнцыялу такіх падзораў і іх тэхнічнай здольнасці выканаць такія аздабленні, а таксама аб свядомым невыкарыстанні імі гэтай функцыі і аб відавочнай наяўнасці пэўных мастацка-стылістычных і кампазіцыйных прыярытэтаў у густах адносна драўлянай архітэктуры, якія панавалі ў горадзе, уплывалі і фармавалі рэальнае будаўніцтва. Усё гэта дадавала пэўныя рысы стварэнню своеасаблівага і непаўторнанага вобліка драўлянай архітэктуры Магілёва канца XIX – сярэдзіны XX стагоддзя.

Бязспрэчна, што дэкаратыўнае аздабленне дахаў, а дакладней франтонаў (шчытоў), будынкаў г. Магілёва канца XIX – сярэдзіны

XX ст., набыло тут найбольшую разнастайнасць і распрацаванасць сярод усіх даследваных традыцый паўднёва-ўсходняй Беларусі, яно тэхналагічна і семантычна выразна адрозніваецца ў тым ліку ад пагарынскай традыцыі аздаблення франтонаў у Цэнтральным Палессі. Гэта сведчыць аб даўно складзенай тут ужо да пачатку XX ст. глыбокай мясцовай традыцыі мэтанакіраванага аздаблення менавіта гэтай часткі будынкаў. Больш за тое, можна ўпэнена сцвярджаць, што яркае своеасаблівае аздабленне шчытоў на франтонах драўляных будынкаў з'яўляецца галоўнай і выразнай асаблівасцю традыцыі драўлянага разьбянога архітэктурнага дэкору г. Магілёва.

У сабраных падчас даследвання матэрыялах па драўлянай архітэктуры Магілёва ёсць шэраг прыкладаў яркіх прыгожых разьбяных ліштваў, у тым ліку змешчаных на ранніх зафіксаваных дамах канца XIX – пачатку XX ст. Аднак статыстычны аналіз сабраных матэрыялаў паказвае, што ў цэлым у гэтым горадзе колькасна відавочна пераважалі сціплыя і звышсціплыя варыянты афармлення вокнаў. Найбольш шырока распаўсюджанымі ў горадзе былі самыя маладэкараваныя тыпы і іх варыянты, у гэты ж час самыя дэкараваныя зафіксаваныя разьбяныя ліштвы вельмі рэдкія, як правіла адзінкавыя. Гэта тэндэнцыя прасочваецца па аналізу як сабраных фотаматэрыялаў у час натурных экспедыцый 2019 г., так і па фотаздымках канца XIX ст. – 1944 г. і пазнейшых.

Нягледзячы на наяўнасць зафіксаваных прыкладаў яркага дэкаратыўнага афармлення вуглоў будынкаў Магілёва ўсе яны з'яўляюцца адзінкавымі і не ўтвараюць нейкіх стабільных распаўсюджаных тыпаў, груп і варыянтаў. Выключэнне складаюць толькі дастаткова часта фіксуемы прыклад ужывання драўлянай "рустоўкі" і некалькі разоў зафіксаванае аздабленне вугла накладной рамай, што ўтварае шэраг вертыкальных ніш. Усё гэта разам сведчыць, што вуглавая зона не з'яўлялася важнай часткай прыкладання ўвагі цесляроў і замоўцаў драўлянай архітэктуры Магілёва канца XIX – сярэдзіны XX ст., а асноўныя іх інтарэсы былі скіраваны на аздабленне іншых частак будынка.

У адрозненне ад дзвярэй на будынках прафесійнай каменнай архітэктуры Магілёва, усе зафіксаваныя прыклады разьбяных дзвярэй ужываных у драўлянай архітэктуры гэтага горада дэманструюць большую сціпласць – адсутнічаюць альбо крайне рэдка ўжываліся накладныя аб’ёмныя элементы, а ўжытыя такія элементы выразна плоскасныя па сваім выкананні. У гэтай сціпласці афармлення разьбой дзвярэй драўляная архітэктура Магілёва выразна адрозніваецца ад аналагічнай, напрыклад, Гомеля, дзе аб’ёмныя элементы значна больш актыўна ўжываліся ў аздабленні не толькі уваходных дзвярэй, але таксама вуглоў, вокнаў, часам нават брам.

Відавочна, што ганкі драўляных будынкаў Магілёва, асабліва II і III тыпаў, па выразнасці ствараемага мастацка-дэкаратыўнага вобраза яскрава вылучаюцца сярод іншых элементаў аздаблення дома на ўзроўні сцен. Асабліва яркі іх кантраст у параўнанні з звышсціплым аздабленнем ліштваў магілёўскіх драўляных будынкаў, якія фізічна знаходзяцца на тым жа ўзроўні, што і ганкі. З іншага боку, гэта чарговы раз падкрэслівае важнасць для мастацка-архітэктурных густаў майстроў і заказчыкаў драўлянай архітэктуры Магілёва канца XIX – сярэдзіны XX ст. дэкаратыўнага аздаблення любога франтона, як на самім доме, так і на яго асобных частках, у прыватнасці на ганках, нават з улікам іх меншых фізічных габарытаў.

Усё пералічанае яскрава сведчыць аб тым, што дэкаратыўнае аздабленне элементаў дома на ўзроўні сцен не ўспрымалася магілёўскімі майстрамі як важная частка стварэння прывабнага эстэтычнага вобраза будынка. Перавага відавочна надавалася верхняй частцы будынка, амаль выключна аздабленню франтона.

Выяўленыя ў час даследвання выразныя асаблівасці аздаблення драўляных дамоў горада Магілёва ў канцы XIX – пачатку XX ст. дазваляюць казаць аб наяўнасці лакальнай традыцыі разьбянога архітэктурнага дэкору, з добра пазнаваемым наборам мастацкіх рыс. Аднак у адрозненне ад чатырох іншых раней зафіксаваных у паўднёва-ўсходняй Беларусі традыцый разьбянога архітэктурнага

дэкору (ніжнепасожскай, бярэзінскай, пагарынскай, ніжнепрыпятскай), магілёўская традыцыя вельмі лакальная, што на сёння з'яўляецца абсалютна незразумелай анамаліяй, улічваючы памер і старажытныя культурныя традыцыі самога горада Магілёва. Мяркуючы па сабраных у час экспедыцый натурных матэрыялах (абследаваныя буйныя паселішчы на паўночны ўсход, усход і поўдзень ад Магілёва, без уліку гарадоў на поўнач і захад ад яго) дадзеная традыцыя ахоплівае амаль выключна толькі горад Магілёў і бліжэйшыя да яго населеныя пункты. Асобныя элементы магілёўскай традыцыі архітэктурнага дэкора (ганкі, аздабленне франтонаў і інш.) часам сустракаюцца на тэрыторыі значна аддаленай ад гэтага горада (у Рагачове, Быхаве, Мсціславе, Чавусах і інш), але гэта адзінкавыя прыклады ў асяроддзі зусім іншых дамінуючых варыянтаў дэкаратыўнага аздаблення і яны не ўтвараюць суцэльнага з Магілёвам тэрытарыяльнага масіва. Гэтым магілёўская традыцыя архітэктурнага дэкору выразна адрозніваецца ад чатырох вышэй ўзгаданых суседніх традыцый, якія дастаткова шчыльна прадстаўлены ў населеных пунктах на непараўнальна большых геаграфічных тэрыторыях і цэнтры бытавання якіх выразна прасочваюцца ўздоўж адпаведных рэк.

Пэўныя дадзеныя – больш позняе фіксуемае ўжыванне прапільной разьбы, больш сціплыя яе варыянты ў параўнанні з суседнімі паўднёвымі тэрыторыямі, а асабліва наяўнасць зафіксаванага прыклада ўжывання ранняга тыпу ліштаў з прамой копіяй ў матэрыялах г.Гомеля другой паловы XIX ст., ускосна сведчыць пра мастацкія ўплывы на магілёўскіх майстроў прыкладаў дэкора верагодна з ніжнепасожскай традыцыі. Аднак выразная своеасаблівасць магілёўскага разьбянога архітэктурнага дэкору, амаль поўная адсутнасць відавочных перайманняў з суседніх тэрыторый і шэраг дакладна мясцовых па паходжанні рыс, сведчаць, што ў сваёй аснове гэта з'ява выключна аўтахтоннага паходжання, новы этап у развіцці мясцовай драўлянай архітэктуры.

## Bibliografia

Lakotka A.Ì., *Pad strèhamì praščuraŭ,* Mìnsk 1995 [Лакотка А.І., *Пад стрэхамі прашчураў,* Мінск 1995]

Lietuvos valstybes istoryjos archyvas (LVIA), f. 544, a. 1, b. 18365, p. 1.

Malìkaŭ Â.R., *Tradycyì raz'bânoga dèkoru ŭ narodnaj arhìtèktury paŭdnëva-ŭshodnâj Belarusì: kanec XIX – peršaâ palova XX st.*, Mìnsk 2016 [Малікаў Я.Р., *Традыцыі разьбянога дэкору ў народнай архітэктуры паўднёва-ўсходняй Беларусі: канец XIX – першая палова XX ст.,* Мінск 2016].

### Peculiarities of the tradition of carved architectural decoration of wooden buildings in the city of Mahilew at the end of the 19th – mid-20th centuries.

The article describes the tradition of carved ornamentation of wooden architecture in the late 19th – mid-20th centuries of the Belarusian city of Mahilew. Based on the analysis of a large number of collected photographic materials on this topic, the classification of the architectural ornamentation used is presented, and the characteristic features of the decoration of wooden architecture in this city are identified and described.
Keywords: carved architectural decor, decorative window frame, pediment, artistic-decorative image, wooden building